УДК 37.091.64:910:908

**В. У. Русак**, кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык (БДТУ)

# МЕТОДЫКА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ НА ЗАНЯТКАХ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ «КРАІНАЗНАЎСТВА І КРАЯЗНАЎСТВА»

Артыкул прысвечаны апісанню адметнасцей арганізацыі самастойнай работы студэнтаў спецыяльнасці «Турызм і прыродакарыстанне» на занятках па дысцыпліне «Краіназнаўства і краязнаўства». Аўтар разглядае асноўныя тыпы і тэматыку заданняў для самастойнай работы студэнтаў, а таксама магчымыя спосабы іх выканання.

This paper presents a study of the organization of independent students' work at the lessons of «Study of a Country and of a Region» (the specialty «Tourism and the Usage of the Nature»). The author describes basic types and the themes of the tasks for independent students' work and the practicable methods of the resolve of these tasks.

**Уводзіны.** У апошні час ва ўсім свеце вялікая ўвага надаецца *кампетэнцыі* будучых спецыялістаў – тым агульным здольнасцям, якія заснаваны на ведах, вопыце, каштоўнасцях, набытых у працэсе навучання. Важнай кампетэнцыяй выпускнікоў лічыцца ўменне атрымліваць найноўшую інфармацыю, удзельнічаць у прыняцці рашэнняў, крытычна мысліць, вырашаць праблемныя сітуацыі і г. д. Для падрыхтоўкі такіх спецыялістаў неабходна, каб у адукацыйным працэсе студэнты выступалі ў ролі не толькі аб'ектаў, але і суб'ектаў навучання, г. зн. маглі самастойна здабываць веды, кантраліраваць і ацэньваць вынікі сваёй пазнавальнай дзейнасці.

Самастойная работа студэнтаў станоўча ацэнена спецыялістамі ў галіне педагогікі і псіхалогіі вышэйшай школы. Адзначаецца, што «ў працэсе самастойнай дзейнасці студэнт выступае як актыўная творчая асоба, як стваральнік сваёй культуры, эрудыцыі, адукацыі» [1, с. 112], што «індывідуальны пошук садзейнічае развіццю цікаўнасці, дапытлівасці, арыентуе на даследчую работу тэарэтычнага ці вопытна-эксперыментальнага ўзроўняў» [2, с. 103]. Акрамя таго, варта прызнаць, што ва ўмовах сучасных ВНУ пры вялізным аб'ёме вучэбнага матэрыялу, які рэкамендаваны праграмамі, абыйсціся без самастойнай работы ў аўдыторны і пазааўдыторны час проста немагчыма.

Неабходна, аднак, разумець, што для дасягнення вучэбна-прафесійнага эфекту ад самастойнай работы выкладчыкі павінны актыўна ўдзельнічаць у яе арганізацыі:

- вызначаць тэмы, над асэнсаваннем якіх студэнты будуць працаваць самастойна;
- распрацоўваць сістэму заданняў з улікам адукацыйных магчымасцей і індывідуальных здольнасцей студэнтаў;
- акрэсліваць магчымыя спосабы выканання прапанаваных заданняў;
- распрацоўваць сістэму кантролю і ацэнкі выкананых заданняў;
- рэгулярна аказваць кансультацыйную дапамогу; стымуляваць і пабуджаць студэнтаў да актыўнай творчай вучэбнай дзейнасці;
- перыядычна ажыццяўляць кантроль.

**Асноўная частка.** Самастойная работа выступае істотнай часткай вучэбнага працэсу пры выкладанні «Краіназнаўства і краязнаўства» – адной з цыкла агульна-прафесійных і спецыяльных дысцыплін (кампанент ВНУ), прызначаных для падрыхтоўкі студэнтаў спецыяльнасці 1-89 02 02 «Турызм і прыродакарыстанне». Мэтай вывучэння гэтай дысцыпліны з'яўляецца фарміраванне ў будучых спецыялістаў усебаковых ведаў пра Беларусь (яе геаграфічнае размяшчэнне, прыродна-рэсурсны патэнцыял, гісторыю, культуру, культурна-гістарычныя каштоўнасці), выпрацоўка навыкаў краязнаўчага даследавання пэўнай мясцовасці, уменняў прадстаўляць розныя рэгіёны Беларусі ў якасці аб'ектаў турызму.

Вучэбным планам на выкладанне «Краіназнаўства і краязнаўства» выдзелена 68 аўдыторных гадзін (50 лекцыйных і 18 практычных). На самастойную кантралюемую работу, для эфектыўнага ажыццяўлення якой былі распрацаваны заданні двух тыпаў: семінарскія і праектныя, адведзена 32 гадзіны. Семінарскія заданні выконваюцца студэнтамі да практычных заняткаў. Над праектнымі ж яны працуюць на працягу семестра і прадстаўляюць выкладчыку вынікі сваёй дзейнасці да пачатку экзаменацыйнай сесіі.

У якасці **семінарскіх** выкарыстоўваюцца заданні некалькіх тыпаў.

Па-першае, гэта ***праблемныя пытанні і заданні***. Пошук адказаў на праблемныя пытанні актывізуе мысленчую дзейнасць, вымушае студэнтаў перайсці ад рэпрадуктыўнага ўзроўню засваення ведаў да прадуктыўнага, творчага, арыентуе на перанос раней засвоеных ведаў і ўменняў у новую сітуацыю. Аднак трэба ўлічваць, што праблемныя пытанні і заданні маюць адукацыйную каштоўнасць толькі ў тым выпадку, калі выклікаюць цікавасць у навучэнцаў і калі

навучэнцы разумеюць, што рашэнне праблемы ў цэлым ім па сілах, паколькі частка неабходных ведаў у іх ёсць. У якасці прыкладу заданняў праблемнага характару можна прывесці наступныя: *Ці справядліва меркаванне, што краіназнаўства выступае навуковай асновай турызму* (прадугледжана пры вывучэнні тэмы «Краіназнаўства як навука. Месца краіназнаўства ў сістэме навук»); *Складзіце пералік прыродных рэсурсаў Беларусі, якія можна выкарыстаць для развіцця турыстычнай сферы* (тэма «Геаграфічнае становішча Беларусі»); *Назавіце прадметы жывой і нежывой прыроды* (*жывёлы, дрэвы, расліны і інш.*), *якія могуць лічыцца нацыянальнымі сімваламі беларусаў* (тэма «Дзяржаўныя сімвалы Беларусі»); *Акрэсліце значэнне фальклору ў арганізацыі турыстычнай дзейнасці* (тэма «Беларускі фальклор»).

Па-другое, ***заданні пошукавага характару.*** Студэнтам прапануюцца тэмы рэфератаў і дакладаў, падрыхтоўка якіх прадугледжвае самастойны пошук неабходных крыніц інфармацыі, працу з даведачнай літаратурай і г. д. Напрыклад: *Герб майго роднага горада* (прапануецца пры вывучэнні тэмы «Дзяржаўныя сімвалы Беларусі»); *Турыстычны патэнцыял прамысловасці і сельскай гаспадаркі майго раёна* (тэма «Народная гаспадарка Беларусі»); *Прадметы культавага прызначэння* (*ідалы, валуны, каменныя крыжы і інш.*) *як унікальныя аб'екты экскурсійнага паказу майго раёна*; *Рэлігійныя абрады і традыцыі ў побыце жыхароў маёй вёскі* (*сяла, мястэчка*) (тэма «Рэлігія на Беларусі»); *Школа мінулага ў нашым краі* (*вёсцы, горадзе, мястэчку*); *БДТУ – гонар дзяржавы* (тэма «Адукацыя і навука Беларусі»); *Гісторыя тапонімаў, мікратапонімаў і гідронімаў маёй «малой» радзімы*; *Прозвішчы, тыповыя для майго роднага краю* (тэма «Тапаніміка і антрапаніміка ў краязнаўстве»).

Па-трэцяе, ***пошукава-творчыя заданні***. Яны прадугледжваюць стварэнне фота- і відэаматэрыялаў, прысвечаных помнікам гісторыі, архітэктуры, культуры, прыроды Беларусі. Заданні гэтага тыпу звязаны не толькі з пошукам патрэбнай інфармацыі, але яшчэ і з творчым падыходам да афармлення сабранага матэрыялу і яго падачы аўдыторыі. Да створаных прэзентацый і слайд-шоу студэнты рыхтуюць вусныя паведамленні, каментарыі. Тэкст для вуснага суправаджэння неабходна скласці так, каб зацікавіць аўдыторыю, данесці да гледачоў самае важнае і значнае пра вывучаны аб'ект. Для гэтага неабходна выдзеліць словы, на якія падае лагічны націск, вылучыць найбольш важныя імёны, даты і інш. Ацэнка пошукава-творчых заданняў улічвае не толькі змест, але і ўменне будучага спецыяліста ў сферы турызму ўтрымліваць увагу аўдыторыі, выклікаць зацікаўленасць сваім паведамленнем. Пошукава-творчыя заданні выконваюцца па тэмах наступнага тыпу: *Полацкі Сафійскі сабор – шэдэўр старажытнабеларускага дойлідства, яго дзяржаўнае значэнне і роля ў развіцці нацыянальнай архітэктуры*; *Барысаглебская* (*Каложская*) *царква – шэдэўр Гродзенскай архітэктурнай школы*; *Замкі-кастэлі ў Лідзе, Крэве як помнікі ваенна-абарончага дойлідства*; *Гісторыя ўзнікнення і канструкцыйныя адметнасці Навагрудскага і Гродзенскага замкаў*; *Мірскі замак як помнік палацава-паркавага дойлідства*; *Помнікі палацава-паркавага дойлідства ў Гальшанах і Нясвіжы*; *Палацава-паркавы ансамбль у Ружанах, яго гісторыка-культурная каштоўнасць*; *Палацы ў Жылічах, Снове як помнікі архітэктуры класіцызму*; *Лошыцкі маёнткава-паркавы комплекс у Мінску*; *Палац Пуслоўскіх у г. Косава як узор архітэктуры рамантызму*; *Беларускія валуны як унікальныя аб'екты экскурсійнага паказу. Музей валуноў у Мінску*; *Помнікі і памятныя месцы Паўночнай вайны 1700–1721 гг. і Першай сусветнай вайны*; *Помнікі Вялікай Айчыннай вайны* (*Хатынь, Лінія Сталіна, Курган Славы і інш.*); *Памятныя месцы паўстання Т. Касцюшкі, вайны 1812 г., нацыянальна-вызваленчага паўстання К. Каліноўскага 1863–1864 гг.*; *Віцебск як цэнтр авангарднага мастацтва пачатку XX ст., горад Марка Шагала і Казіміра Малевіча*; *Памятныя месцы на Беларусі, звязаныя з жыццём і дзейнасцю знакамітых прадстаўнікоў нацыянальнай і сусветнай культуры, навукі, мастацтва* і інш.

Выступленні з вынікамі пошукава-творчай дзейнасці можна арганізоўваць як на практычных занятках, так і на лекцыях. Шэраг студэнтаў, якія маюць заданні па адной тэме (напрыклад, «Помнікі архітэктуры», «Помнікі гісторыі», «Помнікі прыроды» і інш.), аб'ядноўваюцца ў змешаную лектарскую групу і пад кіраўніцтвам выкладчыка распрацоўваюць лекцыйныя заняткі з дэманстрацыяй фота- і відэаматэрыялаў.

Выкананне семінарскіх заданняў можа быць як індывідуальным, так і групавым. Усё залежыць ад складанасці выбранай тэмы і характару вывучаемага матэрыялу. Як паказвае практыка, у некаторых выпадках больш эфектыўнай з'яўляецца работа ў групах па 2–4 чалавекі. Перад групай студэнтаў, якія працуюць над адной тэмай, ставіцца задача абмеркаваць заданне, выбраць шляхі яго выканання, падрыхтаваць выступленне. Затым адзін прадстаўнік групы выступае з паведамленнем, а астатнія дэманструюць аўдыторыі наглядныя матэрыялы, апорныя сігналы, што, як адзначаецца спецыялістамі, павышае якасць успрыняцця матэрыялу і яго запамінанне [3, с. 11]. Сумесная праца падштурхоўвае студэнтаў да ўзаемнай інтэлектуальнай актыўнасці, развівае

індывідуальныя здольнасці кожнага навучэнца, фарміруе такія якасці, неабходныя для супрацоўніцтва, як асабістая адказнасць і зацікаўленасць у агульным поспеху.

У якасці **праектнага** самастойнага задання на занятках па «Краіназнаўстве і краязнаўстве» студэнтам прапанавана складанне комплекснай характарыстыкі культурна-гістарычнага патэнцыялу аднаго з турысцка-экскурсійных цэнтраў Беларусі. Рэкамендуецца выбраць у якасці аб'екта даследавання адзін з пералічаных гарадоў: *Бабруйск*, *Браслаў*, *Барысаў*, *Брэст*, *Віцебск*, *Ваўкавыск*, *Валожын*, *Глыбокае*, *Гомель*, *Гродна*, *Дзятлава*, *Жыровічы*, *Заслаўе*, *Камянец*, *Кобрын*, *Косава*, *Ліда*, *Лагойск*, *Мінск*, *Мір*, *Магілёў*, *Мсціслаў*, *Нясвіж*, *Навагрудак*, *Орша*, *Пінск*, *Полацк*, *Слонім*, *Паставы*, *Ружаны*, *Тураў*, *Чачэрск*. Акрамя таго, можна выбраць горад, не ўключаны ў прыведзены спіс, калі студэнты маюць зацікаўленасць у яго аналізе.

Абранне ў якасці праектнага задання менавіта комплекснай характарыстыкі культурна-гістарычнага патэнцыялу населенага пункта прадыктавана некалькімі прычынамі:

- па-першае, паспяховае выкананне гэтага задання прадугледжвае сістэмнае засваенне ўсіх тэарэтычных раздзелаў краязнаўства, бо характарыстыка культурна-гістарычнага патэнцыялу ўключае цэлы шэраг пунктаў (тлумачэнне назвы горада; пошук легенд, звязаных з яго заснаваннем і назвай; выяўленне і аналіз асноўных археалагічных помнікаў; помнікаў гісторыі, дойлідства (ваенна-абарончай, культавай, грамадзянскай і жылой архітэктуры, садова-паркавага мастацтва), помнікаў і памятных месцаў, звязаных з развіццём навукі, культуры, мастацтва, тэхнікі і вытворчасці, а таксама з жыццём і дзейнасцю знакамітых людзей; паведамленне пра падзеі культурнага жыцця (фестывалі, ярмаркі, конкурсы); апісанне этнаграфічных адметнасцей мясцовасці, музеяў горада; аналіз сучаснага стану і перспектыў выкарыстання культурна-гістарычнага патэнцыялу горада ў экскурсійным турызме);
- па-другое, заданне мае прыкладны характар, бо непасрэдна звязана з будучай прафесійнай дзейнасцю студэнтаў; пры яго выкананні студэнты бачаць канкрэтную сферу прымянення атрыманых ведаў і ўменняў. Вынікі якасна падрыхтаванага праектнага задання могуць быць укаранёны, г. зн. выкарыстаны для стварэння турыстычных маршрутаў.

Узровень выканання праектнага задання яскрава ілюструе ступень тэарэтычнай падрыхтоўкі студэнта, уменне рацыянальна працаваць з літаратурай, аналітычна мысліць і крэатыўна вырашаць пастаўленыя задачы. Нярэдка праектныя заданні становяцца зыходнай базай для стварэння навукова-даследчых прац. З вынікамі даследаванняў студэнты пасля выступаюць на канферэнцыях, а таксама прадстаўляюць свае работы на ўніверсітэцкія і рэспубліканскія конкурсы.

У дапамогу студэнтам, а таксама з мэтай карэкціроўкі іх дзейнасці і паляпшэння якасці самастойнай работы падрыхтаваны вучэбна-метадычны дапаможнік «Краіназнаўства і краязнаўства» [4], дзе змешчаны апорныя дыдактычныя матэрыялы: фармулёўкі самастойных заданняў, тэмы прэзентацый і слайд-шоу, схема комплекснай характарыстыкі, спіс абавязковай і дадатковай літаратуры.

**Заключэнне.** Выкарыстанне самастойнай творчай работы на занятках па «Краіназнаўстве і краязнаўстве» заснавана на вялізным дыдактычным патэнцыяле гэтага віду вучэбнай дзейнасці студэнтаў. Самастойная работа садзейнічае паглыбленню і пашырэнню ведаў па розных раздзелах дысцыпліны, авалоданню прыёмамі працэсу пазнання роднага краю і яго культурна-гістарычнай спадчыны, яна накіравана на развіццё індывідуальных здольнасцей студэнтаў, а таксама на фарміраванне адказнасці, творчых адносін да абранай прафесіі, гатоўнасці да інавацыйнай дзейнасці.

## Літаратура


1. Дьяченко, М. И. Психология высшей школы: учеб. пособие / М. И. Дьяченко, Л. А. Кондыбович. – Минск: Тесей, 2003. – 352 с.
2. Пионова, Р. С. Педагогика высшей школы: учеб. пособие / Р. С. Пионова. – Минск: Университетское, 2002. – 256 с.
3. Андарало, А. И. Самостоятельная работа слушателей по курсу «Педагогические технологии» (специальность «Педагогическая деятельность специалистов»): учеб.-метод. пособие / А. И. Андарало, И. В. Шеститко, Е. С. Шилова. – 2-е изд. – Минск: БГПУ, 2009. – 75 с.
4. Русак, В. У. Краіназнаўства і краязнаўства: вучэб.-метад. дапаможнік для студэнтаў спецыяльнасці 1-89 02 02 «Турызм і прыродакарыстанне» / В. У. Русак. – Мінск: БДТУ, 2011. – 228 с.


*Пастуліла 02.04.2012*